**Тэма: Складаназалежныя сказы з даданай дапаўняльнай часткай: сродкі сувязі, знакі прыпынку**

<u>Мэта:</u>

- *дапамагчы* вучням асэнсаваць адметныя асаблівасці складаназалежных сказаў з даданымі дапаўняльнымі часткамі, навучыць распазнаваць такія канструкцыі ў тэкстах, даваць ім сінтаксічную характарыстыку;
- *выпрацаваць* уменне самастойна ствараць СЗС з даданай дапаўняльнай часткай;
- *садзейнічаць развіццю* лагічнага мыслення, самакантролю, самаправеркі;
- *садзейнічаць выхаванню* беражлівых адносін да электраэнергіі.

<u>Абсталяванне:</u> падручнік па беларускай мове для 9-га класа, прэзентацыя да ўрока, раздатачны матэрыял, відэаролік па тэме "Энергазберажэнне".

Эпіграф: Сцеражыцеся і дробных марных выдаткаў, бо маленькая прабоіна можа патапіць вялікі карабель.

Франклін Б.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант. Стварэнне эмацыянальнага настрою.***(2 хв.)*

**II. Матывацыйны этап** *(2 хв.)*

Мы з вамі зараз напішам невялікі слоўнікавы дыктант. Я буду дыктаваць словы па-руску, а вы адразу запісваць іх па-беларуску, затым патлумачым правапіс.

Природные ресурсы, пластмассовая упаковка, энергосбережение, не оставляйте мусор, собирать металлолом, эффективные решения, беречь природу, сдавать макулатуру, Год бережливости.

*Прыродныя рэсурсы, пластмасавая ўпакоўка, энергазберажэнне, не пакідайце смецця, збіраць металалом, эфектыўныя рашэнні, берагчы прыроду, здаваць макулатуру, Год беражлівасці*

<u>Настаўнік:</u> На якую тэму гэтыя словы? Як вы думаеце, чаму мы напісалі такі дыктант сёння?*(Праходзіць тэматычны Тыдзень энергазберажэння).*

<u>Настаўнік:</u> Для чаго ён праводзіцца? *(Выявіць узровень падрыхтаванасці вучняў у пытаннях эфектыўнага энергакарыстання, расшырыць свае веды, прапагандзіраваць ідэю сярод бацькоў, грамадскасці.*)

<u>Настаўнік:</u> Ці актуальныя гэтыя пытанні сёння? Чаму? (*адказы вучняў)*

<u>Настаўнік:</u> У рамках гэтага тыдня некаторыя з вас удзельнічалі ў мерапрыемствах, але ж мне хацелася б, каб праз наш урок мовы вы таксама дакрануліся да гэтай тэмы. Эпіграфам да нашага ўрока я прапаную словы

Сцеражыцеся і дробных марных выдаткаў,
бо маленькая прабоіна можа патапіць вялікі карабель.
Франклін Б.

<u>Настаўнік</u>: Як вы іх разумееце?

<u>Настаўнік:</u> Вучыцца эканоміць, шукаць шляхі энергазберажэння мы будзем вывучаючы новую тэму: "Складаназалежны сказ з даданай дапаўняльнай часткай". ". За 1 хвіліну дакажыце неабходнасць гэтай тэмы ў будучым (*для таго, каб граматна пісаць, бо гэта паказчык культуры чалавека; каб добра здаць экзамены, тэсціраванне пасля школы; каб удала пісаць дыктанты і г.д.)*.
Мы з вамі навучымся:

- адрозніваць складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі ад другіх відаў складаназалежных сказаў;
- складаць складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі;
- ужываць у маўленні.

**III. Этап узнаўлення ведаў.** *(5хв.)*
Праверка тэарэтычнага матэрыялу:
- Якія сказы называюцца складанымі? Успомнім з вамі, што вы ведаеце пра складаны сказ і адновім схему.




<u>Настаўнік:</u> Якія сказы называюцца складаназалежнымі? *(Прыклад)*
<u>Настаўнік:</u> Пералічыце яшчэ прыметы складаназалежных сказаў *(наяўнасць дзвюх і большасць частак; часткі звязваюцца падпарадкавальнымі злучнікамі і злучальнымі словамі, іх адрозненне; часткі складаназалежных сказаў нераўнапраўныя: адна з іх галоўная, адна ці больш – даданыя).*

Настаўнік: Якія адносіны вызначаюцца паміж часткамі ў складаназалежных сказах з даданымі азначальнымі часткамі?

Настаўнік: Якія пытанні можна паставіць ад галоўнай да даданай азначальнай часткі?

**IV. Знаёмства з тэмай урока.**

Пр. 80.

- Ці можаце вы мне расказаць што – небудзь пра даданую дапаўняльную частку. Прачытайце правіла на с.91-92 і запоўніце табліцу на сваіх лісціках.

| |
|---|
| Часткі ў складаназалежным сказе звязваюцца пры дапамозе ……. ………………………………………………………………………… |
| Паміж часткамі ў складаназалежным сказе з даданай дапаўняльнай часткай выражаюцца …………….. сэнсавыя адносіны |
| Звычайна даданая частка паясняе …………………………………………….. і стаіць …………… |
| Ад галоўнай часткі да даданай можна паставіць пытанні ………………… ………………………………………………………………………… |
| Паміж часткамі ў складаназалежным сказе з даданай дапаўняльнай часткай ставіцца ………………………………………… |

Настаўнік. Што новага вы даведаліся? Давайце яшчэ раз агучым.

**Фізкультхвілінка.** *(2 хв.)*

Настаўнік. Напэўна, вы ўжо стаміліся, таму я прапаную вам хвілінку адпачыць. Глядзіце на экран і выконвайце гімнастыку для вачэй.

Настаўнік: Давайце запішам і прааналізуем сказы.

*Эколагі ўпэўнены ў тым, што разумнае выкарыстанне энергіі – ключ да паспяховага вырашэння праблемы.*

*Цікава ведаць, што ў Амерыцы дарогі будуць самі выпрацоўваць электрычнасць.*

*Важна, што ў Беларусі таксама пачалі будаваць энергаэфектыўныя дамы.*

*Кожны, хто вучыцца ў нашай школе, стараецца эканоміць энергарэсурсы.*

**V.Этап замацавання.**

Настаўнік: Звярніце увагу на экран. Прачытайце тэкст, устаўце прапушчаныя літары, пастаўце знакі прыпынку, вызначце стыль.

Тэкст (публіцыстычны)

Энергазберажэнне – гэта эканомія электраэнергіі. Ці, іншымі словамі, яе разумнае выкарыстанне. Ашчадны чалавек гатуе чай толькі тады, калі ѐн сапраўды патрэбен, пры гэтым грэе столькі вады, колькі трэба. Наадварот, неэканомны чалавек замест дзвюх-трох шклянак нагрэе двухлітровы чайнік. Неэканомныя людзі забываюць што трэба выключаць святло ў кладоўках, ваннах, пакоях. Супраць “забыўлівасці” можна выкарыстаць той жа прыѐм, што ў халадзільніку, калі лямпачка аўтаматычна ўключаецца-выключаецца.

Энергазберажэнне гэта эканомія электраэнергіі. Ці іншымі словамі яе разумнае выкарыстанне. Ашчадны чалавек гатуе чай толькі тады, калі ѐн сапраўды патрэбен, пры гэтым грэе столькі вады, колькі трэба. Наадварот (не) эканомны чалавек замест дзвюх (трох) шклянак нагрэе двух (літровы) чайнік. (Не) эканомныя людзі забываюць што трэба выключаць святло ў кладоўках ва(нн/н)ах пакоях. Супраць "забыўлівасці" можна выкарыстаць той жа прыѐм, што ў халадзільніку, калі лямпачка аўтаматычна ўключаецца-выключаецца.

- Што вы робіце, каб зберагчы дома электраэнергію?

**Творчае заданне:**

Перабудуйце простыя сказы з пабочнымі словамі ў складаназалежныя з дадзенымі дапаўняльнымі.

- Па-мойму, прастата і даступнасць электраэнергіі спарадзілі ў многіх людзей уяўленне аб невычэрпнасці нашых энергетычных рэсурсаў, прытупілі пачуццё неабходнасці яе эканоміі. *(Я лічу, што прастата і даступнасць электраэнергіі спарадзілі ў многіх людзей уяўленне аб невычэрпнасці нашых энергетычных рэсурсаў, прытупілі пачуццё неабходнасці яе эканоміі.)*
- Безумоўна, мы павінны жыць эканомна. *( Я ўпэўнены, што мы павінны жыць эканомна.)*
- Здаецца, на сэканомленыя грошы сям'я зможа з'ездзіць летам на адпачынак у Сочы. *(Мне здаецца, што на сэканомленыя грошы сям'я зможа з'ездзіць летам на адпачынак у Сочы.)*
- **VI. Карэкцыя ведаў.**
- Адзначце складаназалежны сказ з дадзенай дапаўняльнай, складзіце яго схему.

1.Позна быць беражлівым, калі ўсе растрачана.
2. Пушынка да пушынкі - і выйдзе пярынка.
3. Што сёння зберажэш, заўтра спатрэбіцца.
4. Праца ўзбагачае, а беражлівасць захоўвае.

**VII. Рэфлексія. Ацэнка ведаў.** *(2 хв.)*

1. Як вы думаеце, ці спатрэбяцца вам веды, набытыя на гэтым уроку?
2. Якія складанасці вы адчулі?
3. Ахарактарызуйце ўрок пры дапамозе складаназалежных сказаў.

**Д/З § 16. Практ.82, міні – сачыненне на тэму "Калі б я быў міністрам энергетыкі…" "Калі не будзе электрычнасці…" (на выбар)**

Прагляд відэароліка (па тэме д/з)

**VIII. Заключнае слова.**

<u>Настаўнік</u>. Развітацца з вамі хачу радкамі з верша:

Я – чалавек, Я – цэнтр эканоміі.
Хачу я доўга на зямлі пражыць.
Таму Багаццямі прыроднымі
Мне неабходна даражыць
Павінен я цаніць зямлі дары
Разумна, эканомна, справядліва.
Каб захаваць багацце на вякі,
Павінен я вучыцца эканоміі.